# ВОДЗЫЎ

афіцыйнага апанента на дысертацыю

**СЕЛЯХ Аксаны Аляксандраўны**

«Трансфармацыя паўсядзённага жыцця беларускіх сельскіх дзяўчат у Заходнім Палессі ў 20–80-я гг. XX ст.»,

прадстаўленую да абароны на атрыманне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці

07.00.07 – этнаграфія, этналогія і антрапалогія

**1. Адпаведнасць дысертацыі спецыяльнасці і галіне навукі, па якой яна прадстаўлена да абароны**

Дысертацыя Селях Аксаны Аляксандраўны «Трансфармацыя паўсядзённага жыцця беларускіх сельскіх дзяўчат у Заходнім Палессі ў 20–80-я гг. XX ст.» і зместам, і метадалогіяй даследавання, і сваімі навуковымі вынікамі цалкам адпавядае заяўленай спецыяльнасці 07.00.07 – этнаграфія, этналогія і антрапалогія (сферы даследаванняў паводле пашпарта спецыяльнасці: 5. Гісторыя духоўнай і сацыяльнай культуры (народныя веды, вераванні, звычаі і абрады, светапогляд і этнічная самасвядомасць, сацыяльныя арганізацыі); 7. Традыцыйныя і сучасныя формы сям'і і сямейных адносін). Будучы самастойнай, кваліфікацыйнай навуковай працай, дадзеная дысертацыя адпавядае таксама галіне навукі (гістарычныя навукі), па якой яна прадстаўлена да абароны.

**2. Актуальнасць тэмы дысертацыі**

Актуальнасць тэмы дысертацыі А. А. Селях не выклікае сумніву. Беларуская, як зрэшты і ўсходнеславянская этналогія ў цэлым праяўляла некаторую асцярожнасць у даследаванні полавай і ўзроставай няроўнасці, тым больш у гендарным плане. Не будзем забывацца, што савецкая этналогія ў цэлым настойліва праводзіла лінію "сацыялістычнай мадэлі" вырашэння жаночага пытання, якая абапіралася на тэзіс аб заканадаўча замацаваным раўнапраўі жанчыны і мужчыны. Прапагандысцкі кірунак падобных прац абумовіў акцэнт на амаль выключна станоўчых аспектах такой палітыкі, паўсядзённыя клопаты дзяўчат і тым больш вясковых нават не закраналіся. Аксана Аляксандраўна, наадварот, звяртаецца да розных аспектаў жыцця вясковых дзяўчат у кантэксце палітычных, эканамічных, сацыякультурных працэсаў, што разгортваліся ў Заходнім Палессі і краіне ў цэлым у 20–80-я гг. XX ст.

Актуальнасць даследавання асабліва ўзрастае на фоне сённяшніх грамадскіх зрухаў праз максімальна ўзрослы градус глабалізацыі і лічбавізацыі. Застаецца пагадзіцца з тэзісам самой суіскальніцы, што "даследаванне

паўсядзённасці спрыяе лепшаму разуменню культуры ў цэлым, культурных асаблівасцяў асобных полаўзроставых груп, усведамленню прынцыпаў іх узаемадзеяння ў межах адзінай культурна-кодавай прасторы, а таксама садзейнічае фарміраванню ўласнай ідэнтычнасці, ідэнтычнасці супольнасці” (с. 4). Раскрыццё дысертанткай заканамернасцяў трансфармацыі паўсядзённасці пэўнай сацыяльнай групы знаходзіцца ў адной парадыгме з даволі актуальнай сёння ідэяй пошуку балансу паміж захаваннем традыцыйнага і адкрытасцю да новага, што адпавядае найноўшым тэндэнцыям як у айчыннай, так і замежнай гуманітарыстыцы.

Актуальнасць прапанаванага антрапалагічнага падыходу пры даследаванні жыццядзейнасці ў пэўны час і ў пэўным рэгіёне вызначаецца логікай усяго папярэдняга этапу развіцця навуковых доследаў у галіне вывучэння традыцыйнай культуры, што акрэсліла той корпус задач, метадаў і прынцыпаў, што фармулююцца, абгрунтоўваюцца і доказна ажыццяўляюцца ў дадзенай працы. Аналіз асноўнага зместу дысертацыі, кожнай з чатырох яе глаў толькі ўзмацняе перакананасць у тым, што праца А. А. Селях сучасная, хоць і прысвечана працэсам, якія распачаліся стагоддзе назад.

**3. Ступень навізны вынікаў дысертацыі і навуковых палажэнняў, якія выносяцца на абарону**

Дысертацыйнае даследаванне А. А. Селях, прысвечанае паўсядзённаму жыццю заходнепалескіх сельскіх дзяўчат, выглядае сёння нават наватарскім. Навуковай навізной характарызуецца кожнае з чатырох палажэнняў, якія выносяцца дысертанткай на абарону. Даследуючы спецыфіку дзявочай паўсядзённасці, А. А. Селях выбірае цалкам новы ракурс, з якога яна ацэньвае вынікі даробку сваіх папярэднікаў, каб прапанаваць найбольш адэкватны акрэсленай праблеме падыход – у даным выпадку антрапалагічны. За ўласна фактычным матэрыялам, які дакладна стварае карціну быту заходнепалескай вёскі, аўтар здолеў адчуць і запісаць пачуцці, перажыванні, самарэфлексію інфармантаў. Выкарыстанне падобнага матэрыялу дапамагло выявіць чалавечыя арыенціры паводзінаў у пэўных сацыяльных умовах, прасачыць ідэалагізацыю, міфалагізацыю і фальклярызацыю мінулага. Дзявочы вопыт і сёння надзвычай цесна зніталаваны з перажываннямі і таму менавіта выказванні дзяўчат здольныя перадаць пачуццёвы рэжым часу. Менавіта гэты аспект пераўтварае фармальнае, як бы збоку апісанне быту ў антрапалогію паўсядзённасці.

Упершыню ў беларускай этналогіі быў сістэмна разгледжаны канцэпт “дзявоцтва”; раскрыта сутнасць змен становішча сельскіх дзяўчат у сям’і, вызначана спецыфіка фарміравання і асаблівасці дзявочай субкультуры ў заходнепалескай вёсцы. Па адэкватных крыніцах апісана аб’ектыўная

рэальнасць, у якой сталела дзяўчына. Па-наватарску выглядае прапанаваны дысертанткай аналіз статусных і ролевых пазіцый дзяўчат у тагачаснай вёсцы. Праведзена сістэматызацыя найцікавейшых аўтэнтычных матэрыялаў па розных аспектах дзявочай культуры: ад гульнёвых і магічных практык да працэсаў полавай сацыялізацыі.

Гэтаксама ўпершыню ў беларускай этналогіі была звернута ўвага на мэтазгоднасць даследавання рукапісных артэфактаў, прадстаўленых у шырокай жанравай разнастайнасці (анкеты, альбомы, спеўнікі, дзённікі, сшыткі пажаданняў (Дадатак В, Ф. В4–В9), і сцвярджэнне іх асаблівай ролі ў вывучэнні працэсу сацыялізацыі моладзі. Новым у айчыннай этналогіі можна лічыць і распрацоўку асобных латэнтных формаў культуры.

Наогул, у рабоце шэраг цікавых знаходак, як на ўзроўні зафіксаванага матэрыялу, так і аўтарскіх назіранняў. Прыкладам, матчына навука адной з інфармантак у час атэізацыі (“шо трэба то і говоры, а сама пуд одіялом пэрэхрыстысь”) добра паказвае на ўмовы складвання дваістай маралі, наогул характэрнай для савецкай эпохі.

**4. Абгрунтаванасць і дакладнасць вынікаў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі**

Асноўныя вынікі дысертацыі А. А. Селях цалкам адпавядаюць палажэнням, вынесеным на абарону. Фарміраванню цэласнасці і канцэптуальнай завершанасці дысертацыі спрыяла абазнанасць яе аўтара ў працах беларускіх і расійскіх даследчыкаў, улічаны як ужо класічныя, так і найноўшыя даследаванні па тэме вясковай паўсядзённасці. Цалкам апраўданы зварот да асобных палажэнняў, сфармуляваных прадстаўнікамі сумежных навуковых дысцыплін у вывучэнні асобных аспектаў жыццядзейнасці вясковага соцыуму.

Праблема трансфармацыі дзявочай паўсядзённасці характарызуецца дысертанткай як полідысцыплінарная, што абумовіла інтэграцыю метадалагічнага інструментарыю некалькіх навуковых кірункаў: гендарныя даследаванні, гісторыя паўсядзённасці, сацыяльная антрапалогія, вусная гісторыя. Дакладнасць вынікаў дысертацыі ў многім абумоўленая метадалагічнай гібкасцю, абгрунтавана падабранымі і карэктна ўжытымі метадамі даследавання. Да ўжо названага антрапалагічнага падыходу дадаюцца культуралагічны, гендарны, псіхааналітычны, сістэмна-функцыянальны метадалагічныя падыходы. Варта адзначыць і ўважлівы падыход А. А. Селях да тэрміналагічнай базы даследавання, прапрацоўку ключавых паняццяў, выкарыстаных у працы, – паўсядзённасць, дзявочая паўсядзённасць, трансфармацыя дзявочай паўсядзённасці, традыцыйнае грамадства, дзяўчына. Хоць аўтар не ставіць у цэнтр метадалагічнага апарату такую катэгорыю, як

карціна свету, але менавіта яна ўмяшчае ўніверсальныя і фундаментальныя асновы жыцця заходнепалескай дзяўчыны ў даваенны час.

Абсалютную навізну і дакладнасць дысертацыі забяспечвае ўнікальная фактралагічная база: гэта ў абсалютнай большасці ўласныя запісы. Аўтарам былі праведзены глыбокія нефармалізаваныя і паўфармалізаваныя інтэрв'ю. Агульная колькасць прааналізаваных інтэрв'ю склала 102 адзінкі. Бадай упершыню ў беларускім нарадазнаўстве ў якасці рэпрэзентатыўнага матэрыялу выступілі факты з прыватных архіваў рэспандэнтак (сшыткі, малюнкі, рукапісная дзявочая культура).

Такім чынам, і вынікі дысертацыйнага даследавання А. А. Селях, і рэкамендацыі па практычным выкарыстанні гэтых вынікаў з'яўляюцца абгрунтаванымі і пераканаўчымі.

**5. Навуковая, практычная, эканамічная і сацыяльная значнасць вынікаў дысертацыі з указаннем рэкамендацый па іх выкарыстанні**

Навуковая значнасць вынікаў дысертацыі А. А. Селях заключаецца ў тым, што яны могуць паслужыць для распрацоўкі навуковых тэм, звязаных з даследаваннем спецыфікі трансфармацыйных працэсаў у паўсядзённым жыцці розных сацыяльных груп у розных рэгіёнах Беларусі. Гэтаксама істотным штрыхом выступае ўвага да пункту гледжання непасрэдных удзельнікаў гэтых працэсаў.

Практычная значнасць вынікаў дысертацыі А. А. Селях бачыцца ў тым, што ўсе яны будуць запатрабаваныя выкладчыкамі ВНУ для распрацоўкі лекцыйных і практычных заняткаў, а яшчэ яны могуць паслужыць асновай для напісання курсавых і дыпломных работ, магістарскіх і кандыдацкіх дысертацый. Як слушна заяўлена ў адпаведным раздзеле, напрацоўкі ўжо знайшлі выкарыстанне як у навучальным працэсе Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна, так і шырокай культурніцкай дзейнасці, у краязнаўчай рабоце (с. 122 дысертацыі). Вынікі і надалей можна выкарыстоўваць пры напісанні падручнікаў, дапаможнікаў па этналогіі і гісторыі паўсядзённасці.

Сацыяльная значнасць вынікаў дысертацыі А. А. Селях, бадай, самая заўважная. Працэсы трансфармацыі паўсядзённасці, асэнсаванне іх і нават кіраванне імі магчымыя толькі з улікам разумення папярэдніх этапаў адаптацыі сацыяльных груп да зменлівых знешніх умоў. Увага да гендарных аспектаў традыцыйнай культуры тым больш актуальная, бо ўстойлівасць традыцыйнага гендарнага парытэту забяспечвае ўстойлівасць адпаведнай культуры і адносна стабільнае функцыянаванне соцыуму ў новай рэальнасці.

Асобную навуковую і практычную значнасць складае падрыхтаваны дысертанткай апытальнік (Дадатак Е), што паказальна, распрацаваны не ў

форме анкеты, а даведніка з тэмамі для вольнага факусаванага інтэрв'ю. Тэмы пабудаваныя ў выглядзе "лагічных варонак", што дазваляла мякка факусаваць размову на патрэбных аспектах.

Вартая ўхвалення і ўвага дысертанткі да этналінгвістычнага аспекту апісання паўсядзённасці. У працы захоўваюцца моўна-стылістычныя адметнасці выказванняў інфармантаў, мясцовая дыялектная мова перадавалася адпаведна гучанню. Для перадачы заходнепалескіх гаворак патрэбная адмысловая кваліфікацыя, і Аксана Аляксандраўна ёй валодае.

### 6. Апублікаванасць вынікаў дысертацыі ў навуковых выданнях

Патрабаванні па апублікаванасці вынікаў дысертацыі А. А. Селях выканала у поўным аб'ёме, адлюстраваўшы іх у 36 навуковых работах, з іх 8 – артыкулы, уключаныя ў пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў, 9 – артыкулы ў зборніках навуковых работ, 17 – артыкулы ў зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый, 2 – тэзісы. Аб'ём артыкулаў у выданнях, уключаных ў пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў, складае 5,8 аўтарскага аркуша.

Такім чынам, агульны аб'ём апублікаваных тэкстаў складае 12,5 аўтарскіх аркушаў. Усе апублікаваныя артыкулы дазваляюць зразумець скіраванасць дысертацыі, поўнасцю раскрываюць яе асноўны змест, фарміруюць цэласнае ўяўленне пра кожную главу працы.

### 7. Адпаведнасць афармлення дысертацыі патрабаванням ВАК

Дысертацыйная праца, як і аўтарэферат дысертацыі, аформлены ў адпаведнасці з існуючымі патрабаваннямі Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь.

### 8. Заўвагі па дысертацыі

Усё вышэйсказанае дазваляе сцвярджаць, што навуковыя вынікі, атрыманыя суіскальніцай, з'яўляюцца новымі, арыгінальнымі і несумненна важнымі ў развіцці беларускай этналогіі. Разам з тым, пры чытанні дысертацыі ўзнікаюць некаторыя пытанні або сумневы, якія тычацца прыватных назіранняў аўтара і ніяк не мяняюць агульнай высокай адзнакі гэтага даследавання.

Пры канстатацыі неабходнасці апісання "суцэльнага кантэксту паўсядзённага жыцця заходнепалескіх сельскіх дзяўчат у разгляданы перыяд" (с. 18–19) варта разумець надзвычайную шырыню і ўсеахопнасць паўсядзённасці, што па вызначэнні прааналізаваць у межах адной працы немагчыма. Дысертантка заканамерна абрала для даследавання найбольш прэзентатыўныя аспекты (становішча ў сям'і, выхаванне, адукацыя, грамадскі

статус, дашлюбныя адносіны, вольны час, культура жыццезабеспячэння, убранне). Але варта было б пазначыць, што за межамі разгляду засталіся такія сферы паўсядзённасці, як клопат аб здароўі, іерархічныя ўзаемаадносіны ў межах сацыяльнай структуры вёскі (не толькі сямейнай), этыкет і нормы школьнага жыцця, прафарыентацыйная дзейнасць, народна-рэлігійныя стасункі і інш.

Натуральна, у задачы А. А. Селях не ўваходзіла рэканструкцыя міфапаэтычнага зместу асобных атрыбутаў сферы дзявоцтва, але акцэнт на асобных з іх толькі ўпрыгожыў бы працу. Так, дысертантка сімвалізацыю непрацягласці дзявоцтва як “дывуванне”, “красаванне” тлумачыць тым, што квітненне як прыродная з’ява – часава абмежаваны этап (с. 65). Гэта сапраўды так, але сімвалізацыя дзяўчыны як кветкі ўваходзіць у склад больш разгорнутай міфапаэтычнай метафары жыцця жанчыны як вегетацыйнага цыклу, дзе квітненне з неабходнасцю змяніцца апыленнем / аплодненнем і завязваннем плоду / новага жыцця.

Абмежаванай падаецца падача ўдзелу дзяўчат у абрадавым комплексе Заходняга Палесся. Між тым якраз гэта тэрыторыя вылучае такі яркі абрад, як ваджэнне Куста, калі група, якая так і называецца «войско дэвоцкэе» на чале з Кустам абходзіць падвор’і. Наогул, роля дзяўчат у веснавой абраднасці надзвычай высокая, бо абапіраецца на сімвалічны ізамарфізм маладосці дзяўчыны і каляндарнага перыяду – вясны. Да шэрагу каляндарных святаў прымяркоўваліся выключна дзявочыя рытуальныя дзеі (скокі дзяўчат на Сараکі на дошках і пад.).

Не як заўвагу, а хутчэй як дапаўненне да прыведзеных звестак хацелася б выказаць наступнае. У шматгранным даследаванні трансфармацыі ўбораў і прычоскі дзяўчат выпушчаны семіятычны статус касы для дзяўчыны, калі яе першае заплятанне сведчыла аб пераходзе ў новую ўзроставую катэгорыю, а рытуальнае расплятанне сігналізавала аб развітанні з дзявоцтвам, бо заплятанне дзвюх кос і надзяванне жаночага галаўнога ўбору зацвярджалі пераход у жаночы статус. Нароўні з касой выключна дзявочым атрыбутам быў і вянок як сігнал яе дзявоцкасці, набрыняласці прыгажосцю і гатоўнасцю да працягу роду. Своеасаблівым пераемнікам сімвалічнага статусу вянка стаў вясельны букет (ізноў тая ж адсылка да дзявоцтва як квітнення). Да сёння захоўваецца звычай кідаць букет сяброўкам як дэманстрацыя непарыўнасці і захавання плоднасці і працягу роду ў даным соцыуме.

Аднак, дадзеныя заўвагі носяць характар пажаданняў і ўдакладненняў і не ўплываюць на агульны навуковы ўзровень дысертацыі.

**9. Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе**

Навуковы характар, актуальнасць і наватарства кваліфікацыйнай працы А.А. Селях, выкарыстаныя дысертанткай метады і прыёмы даследавання, трапныя назіранні і лагічныя высновы, – усё сведчыць аб тым, што навуковая кваліфікацыя саіскальніка адпавядае вучонай ступені кандыдата гістарычных навук.

**10. Заключэнне**

Падагульняючы вышэй сказанае, можна зрабіць выснову, што дысертацыя Аксаны Аляксандраўны Селях «Трансфармацыя паўсядзённага жыцця беларускіх сельскіх дзяўчат у Заходнім Палессі ў 20–80-я гг. XX ст.» з'яўляецца грунтоўным, цікавым, самастойным даследаваннем, якое ўносіць заўважны ўклад не толькі ў айчыннае, але і ў славянскае нарадазнаўства.

Праца цалкам адпавядае патрабаванням, акрэсленым у трэцяй главе «Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеней і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь».

Вучоную ступень кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.07 – этнаграфія, этналогія і антрапалогія аўтару дысертацыі «Трансфармацыя паўсядзённага жыцця беларускіх сельскіх дзяўчат у Заходнім Палессі ў 20–80-я гг. XX ст.» можна прысудзіць ЗА:

– усебаковую характарыстыку сацыякультурнага ландшафту заходнепалескай вёскі як прасторы дзявочай паўсядзённасці;

–даследаванне асаблівасцяў жаночай сацыяльнай памяці сярэдзіны XX ст. і характарыстыку працэсу фарміравання каштоўнасных арыентацый вясковых дзяўчат;

–сістэмны разгляд канцэпту "дзявоцтва"; раскрыццё сутнасці змен становішча сельскіх дзяўчат у сям'і, аналіз дынамікі іх грамадскіх статусных і ролевых пазіцый;

–вызначэнне асноўных кірункаў і вынікаў працэсу зменаў паводзін дзяўчат у дашлюбны перыяд

–выяўленне механізмаў і характару забеспячэння базавых патрэб сельскіх дзяўчат у сістэме сацыяльных адносін і культурных практык тагачаснай вёскі.

Афіцыйны апанент:
доктар філалагічных навук, прафесар,
загадчык аддзела фальклярыстыкі
і культуры славянскіх народаў Цэнтра
даследаванняў беларускай культуры,
мовы і літаратуры НАН Беларусі Т.В. Валодзіна

ДЛЯ ДАКУМЕНТАЎ
ПОДПИСЬ
УДОСТОВЕРЯЮ
09 . 06 2026 г.